■ Важнае пытанне

# ПРАКТЫЧНАЯ ФІЛАСОФІЯ: ЦІ МАГЧЫМА ГЭТА?

**Структурныя рэформы ў Нацыянальнай акадэміі навук, скіраваныя ў першую чаргу на павышэнне практычных вынікаў працы ўстановы, пачаліся з прыродазнаўчых падраздзяленняў. Цяпер надышла чарга гуманітарных. Але калі накіраваць у практычны бок, напрыклад, фізіку ці эканоміку, здаецца, не так цяжка, то што рабіць з навукамі аб чалавеку? Першыя вынікі стварэння практыкаарыентаваных цэнтраў (так званых кластараў) у гуманітарных установах можна было ацаніць падчас нядаўняй Другой міжнароднай навуковай канферэнцыі «Інтэлектуальная культура Беларусі: кіраванне ведамі ў кантэксце задач сацыяльна-эканамічнай мадэрнізацыі», што прайшла ў Інстытуце філасофіі НАН.**

Удзел у форуме ўзялі дзясяткі навукоўцаў і экспертаў з Беларусі, Казахстана, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны. Сярод іх былі як навукоўцы-філосафы, так і прадстаўнікі органаў дзяржкіравання, сістэмы адукацыі, дзелавых кругоў, буйных прадпрыемстваў. Агульная задача канферэнцыі фармулявалася наступным чынам: суаднесці інтэлектуальны капітал краіны з рэальным досведам кіравання ведамі і кампетэнцыямі.

На гэтым сканцэнтраваў увагу ў сваёй прамове **акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Аляксандр КАВАЛЕНЯ.** Па яго словах, цяпер перад краінай стаіць задача не толькі тэхнічнай мадэрнізацыі, але і ўдасканалення кіравання чалавечым капіталам. Дзеля гэтага акадэмік прапанаваў стварыць па выніках канферэнцыі працоўную групу, якая занялася б унясеннем прапаноў у міністэрствы і ведамствы краіны (у першую чаргу — у Міністэрства адукацыі), Адміністрацыю Прэзідэнта, Нацыянальны сход.

Варта сказаць, што прамовы выступоўцаў на адкрыцці канферэнцыі падзяляліся на дзве часткі. Мерапрыемства пачалося з выступлення **дырэктара Інстытута філасофіі акадэміі навук Анатоля ЛАЗАРЭВІЧА.** Ён распавёў пра дзейнасць кластара, створанага на базе інстытута — Рэспубліканскага цэнтра фундаментальнай і практычнай філасофіі.

**Загадчык кафедры філасофіі і метадалогіі навукі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Анатоль ЗЕЛЯНКОЎ** у сваю чаргу выказаў пэўную заклапочанасць магчымымі перагібамі пры пераарыентацыі філасофіі ў бок практыкі. «Няма нічога больш практычнага за добрую тэорыю», — прывёў навуковец цытату, якую прыпісваюць розным асобам.

Пытанні кіравання інтэлектуальнымі рэсурсамі ва ўмовах сеткавага грамадства і інтэграцыйных працэсаў закранула **дырэктар Інстытута сацыяльна-гуманітарнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Ядвіга ЯСКЕВІЧ.** Асабліва яна звярнула ўвагу на захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці падчас глабалізацыі.

Кантрасна на гэтым фоне выглядалі выступленні спецыялістаў-практыкаў, што спыніліся на асноўных праблемах, з якімі сутыкаюцца ў сваёй працы іх прадпрыемствы. **Дырэктар па персанале групы кампаній «Алютэх» Аляксандр МУДРЫК** скіраваў увагу слухачоў на галоўныя праблемы, у вырашэнні якіх можа дапамагчы акадэмічная навука.

Паводле слоў спецыяліста, асноўнае, чаго не стае беларускім кампаніям цяпер, — гэта якасныя чалавечыя рэсурсы, ад якіх можна было б атрымліваць максімальную аддачу. Сярод аспектаў працы HR-аддзелаў ён вылучыў непасрэдна прыцягненне і ўтрыманне спецыялістаў высокага ўзроўню, стварэнне HR-брэндаў («кампаніі, у якіх хочацца працаваць»), стварэнне ўласных сістэм рэкрутынгу буйнымі прадпрыемствамі. Асаблівая дэтальна абмяркоўвалася апошняе. Па меркаванні Аляксандра Мудрыка, выпускнікі беларускіх ВНУ абсалютна не адпавядаюць высокім стандартам вялікіх кампаній. З гэтай прычыны прадпрыемствы ствараюць свае навучальныя ўстановы і праграмы, як, напрыклад, «Алюстарт» у кампаніі самога Аляксандра. За два тыдні суіскальнікі праходзяць поўную перападрыхтоўку па сваёй будучай спецыяльнасці з ухілам на фарміраванне канкрэтных здольнасцей.

Спецыяліст звярнуў увагу і на падрыхтоўку студэнтаў па асобных спецыяльнасцях. «Эфектыўнаму менеджменту павінны навучаць тыя, хто ім займаецца, а не тыя, хто прачытаў па тэме шмат літаратуры, — зазначыў Аляксандр Мудрык. — У сённяшніх умовах усё вельмі хутка змяняецца, і ніякія кнігі не заменяць уласны досвед. На жаль, сярод універсітэцкіх выкладчыкаў доля практыкуючых менеджараў складае каля 7%».

Галоўны трэнд у сучасным падборы персаналу, па меркаванні Аляксандра Мудрыка, звяртанне ўвагі не на працоўны вопыт ці інтэлект, а на патэнцыял магчымага супрацоўніка. Ці ёсць у работніка здольнасць хутка асвойваць новае? Ці можа ён гнутка адаптавацца да новых умоў? Ці здольны выконваць новыя ролі? Гэтыя пытанні для сучасных «рэкрутараў» становяцца асноўнымі. Матывацыя, цікаўнасць, праніклівасць, уменне пераконваць, мэтанакіраванасць — галоўныя пункты ацэнкі суіскальніка. Аднак сістэма патрабуе больш дакладнай і глыбокай методыкі выяўлення найлепшых. Менавіта ў гэтым, на думку Аляксандра Мудрыка, заключаецца галоўная задача акадэмічнай навукі.

Прыкладна ў такім жа кірунку выступіў іншы спецыяліст-практык — **бізнес-трэнер, кансультант, дырэктар цэнтра падрыхтоўкі IT-спецыялістаў «QA Акадэмія» Юрый АНУШКІН.** Па яго словах, калі сённяшняя сітуацыя будзе працягвацца, то ўжо ў самай блізкай перспектыве спецыялізаваныя адукацыйныя ўстановы, створаныя ў тым ліку і пры асобных прадпрыемствах, змогуць перацягнуць суіскальнікаў да сябе. Менавіта выступленні двух апошніх спецыялістаў выклікалі найбольшы рэзананс і сталі каталізатарам актыўнага абмеркавання.

Ці змогуць практыкі і тэарэтыкі паразумецца, а акадэмічная навука дапамагчы эканоміцы краіны? Адказ на гэтыя пытанні мы, відаць, атрымаем у найбліжэйшыя часы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

# БЫЎ. ЁСЦЬ. БУДЗЕ

**У Віцебску ўручылі літаратурную прэмію аблвыканкама імя Уладзіміра Караткевіча і ўганаравалі пераможцаў маладзёжнага конкурсу.**

— Прэмію імя Уладзіміра Караткевіча за ўсе гады яе існавання атрымалі больш за 20 чалавек. І сярод іх не толькі літаратары, а і работнікі культуры, адукацыі. Лаўрэатамі сталі і калектывы аршанскага музея Караткевіча, віцебскай бібліятэкі, якая носіць яго імя... У абласным літаратурным конкурсе сярод моладзі «Быў. Ёсць. Буду...» бралі ўдзел больш за 500 школьнікаў, студэнтаў, хлопцаў і дзяўчат, якія ўжо працуюць, — распавядае **старшыня Віцебскага абласнога аддзялення «Саюза пісьменнікаў Беларусі» Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА.** — У выніку журы вызначыла каля 30 пераможцаў. А 20 творчых работ было адзначана падзякамі.



Адным з лаўрэатаў літаратурнай прэміі ў намінацыі «проза» стаў **Ігар ПРАКАПОВІЧ.** Ён выкладае ў гімназіі №1 Пастаў, кіруе навуковым краязнаўчым таварыствам.

— Над выданнем «Чароўны край — Пастаўшчына» я працаваў больш за 30 гадоў. Яго асаблівасць у тым, што ёсць яшчэ і сшытак па курсе «Паставязнаўства». У камплект таксама ўваходзіць дыск з прэзентацыямі краю. Там шмат фотаздымкаў, якія зрабілі лепшыя пастаўскія фатографы, — расказаў лаўрэат.

У Віцебскім лялечным тэатры паводле твораў Караткевіча пастаўлены тры спектаклі. Тэатр «Лялька» стаў лаўрэатам за прапаганду жыцця і творчасці Уладзіміра Сямёнавіча.

— «Ладдзя роспачы» — гэта шэдэўр. Ды ўсё, што напісаў Уладзімір Сямёнавіч — геніяльна! Мы пастараліся, каб Караткевіч «загаварыў» на «лялечнай мове». Упэўнены, у нас гэта атрымалася! — эмацыянальна падкрэсліў **Віктар КЛІМЧУК, мастацкі кіраўнік Беларускага тэатра «Лялька».**

Калі ён распавядаў пра творчыя пошукі падчас пастановак па Караткевічу, нагадаў яго словы: «І калі ты не створыш такой песні ў гонар Радзімы і волі, вайны і любові, то шэлег табе цана, і лепш бы табе ніколі не быць паэтам. Такіх хопіць і без цябе».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Свой погляд

# ДАЙЦЕ МУЖЧЫНАМ БЫЦЬ МУЖЧЫНАМІ!



**«Няма сапраўдных мужчын...» — гэтае галашэнне чуецца ў разнастайных варыяцыях. Сапраўдны мужык звёўся, здрабнеў, змізарнеў, і пара яго занесці ў Чырвоную кнігу — побач з вяртлявай чаротаўкай і даўгахвостым лімнакалянусам. Так, жанчыны часам празмерна крытычныя да нас, мужчын. Але ў гэтым выпадку мушу прызнаць горкую праўду: моцная палова чалавецтва ў наш час не такая ўжо і моцная. Высакародныя рыцары без страху і заганы, мужныя і адначасова пяшчотныя, засталіся на зашмальцаваных старонках старасвецкіх раманаў.**

Але на ўсё ёсць прычына. І мужчынская бязвольнасць або эгаізм — гэта не проста праява суб'ектыўных рыс характару. Ёсць і аб'ектыўныя абставіны, якія заахвочваюць мужчын паводзіць сябе менавіта так, а не інакш. Вось чаму, напрыклад, у жырафы вырасла такая доўгая шыя? Каб пад'ядаць лісце з верхніх галінак. А чаму крот амаль сляпы? Бо пад зямлёй ад тых вачэй толку, як ад кажуха ў лазні. Арганізмы так ці інакш прыстасоўваюцца да навакольных умоў. Нешта набываюць, нешта страчваюць.

Штосьці падобнае адбываецца і ў грамадстве. У кожную эпоху запатрабаваны пэўны тып чалавека. Некалі ідэалам лічыўся суровы мужык, які і зямлю ўзараць можа, і чарговым шведа-манголам даць прачуханца. Мужчыны, на якіх скардзяцца сучасныя паненкі, — таксама прадукт эпохі. І залежыць якасць гэтага «прадукту» ад тых патрабаванняў, што да яго прад'яўляюцца. У тым ліку з боку жаночай супольнасці.

На словах дзяўчаты, вядома, чакаюць рыцараў. І бясконца вывешваюць у сацыяльных сетках пафасныя допісы пра Сапраўднага Мужчыну. Мужнага, абаяльнага, шчодрага, вернага, разумнага, багатага: Ален Дэлон, Брэд Піт і Біл Гейтс у адным флаконе. Але па жыцці жанчыны дэманструюць зусім адваротнае — цярплівасць і непатрабавальнасць.

У гэтым я пераканаўся ў юнацтве. Кветкі, вершы, зоркі з неба — такі стандарт адносін з дзяўчатамі некалі здаваўся мне адзіна магчымым. Але навучанне на гуманітарным факультэце развеяла ілюзіі. Факультэцкія «камсамолкі, спартсменкі і проста прыгажуні» чэпляюцца мелі за кавалераў такіх «персанажаў», што ажно дрыжыкі бралі. Высветлілася, што пры сваёй дзяўчыне можна сыпаць мацюкамі, бы гарохам. А таксама мацаць яе за «апетытныя» месцы пасярод вуліцы. І не тэлефанаваць тыднямі... Не, я нікога не асуджаю. Сам не анёл. Але ж як гэтыя дзявочыя цярплівасць і некрытычнасць ужываюцца з марамі аб «прыўкрасным прынцу»? Дзе логіка?

**«Сапраўдны мужык», па якім уздыхаюць паненкі і кабеты, — ён звычайна «нязручны». Ён забяспечвае сям'ю, здольны самастойна прымаць рашэнні і быць той самай «каменнай сцяной». Але ёсць і «пабочныя эфекты».**

Зрэшты, добрыя дзяўчаты часта любяць кепскіх хлопцаў. Закон прыцягнення супрацьлегласцяў. Але і з узростам паненкі не становяцца больш пераборлівымі. Наадварот, пару разоў «апёкшыся», жанчына разважае, што «лепей хоць які мужык, чым ніякага». Вось і жывуць з «хоць якімі». Гадамі цярпяць ад іх п'янства, пабоі, знявагі і іншыя праявы неадэкватнасці. І бездапаможна разводзяць рукамі: «У нас жа дзеці...», «Не хочацца сям'ю разбураць...» Хоць мне бачыцца іншая прычына — падсвядомая боязь страціць свайго «хоць якога». І гэта прымушае наступіць на горла ўласнай годнасці і гонару.

Ёсць меркаванне, што ўся бяда ў гендарным перакосе. У адрозненне ад краін Захаду, жанчын у нас болей, чым мужчын. Немка ці якая шведка можа дазволіць сабе выйсці з дома без макіяжу і ў падкрэслена асэксуальным адзенні. Нашыя жанчыны нават у краму ходзяць на абцасах і з падведзенымі вуснамі. І ў гэтым бачыцца не толькі эстэтыка. У нас дамы вымушаны канкураваць паміж сабой за кавалераў, а не наадварот. Таму ў мужчын няма стымулу ўласную мужчынскасць развіваць.

А яшчэ гэтая самая мужчынскасць змалку душыцца немужчынскім выхаваннем. Сістэма школьнай адукацыі даўно стала наскрозь жаночай. Нічога не маю супраць педагогаў-жанчын. Але яны самі прызнаюць, што мужчынскай школе катастрафічна нестае. (Чаму так сталася — асобная гаворка.) Зрэшты, застаецца сям'я, дзе павінна быць цвёрдая бацькава рука. Але «павінна» — не значыць «ёсць». У наш час сямейныя супярэчнасці ўсё часцей вырашаюць разводам, калі дзеці застаюцца з маці. І трэба аддаць належнае жанчынам: многія з іх здольныя самастойна забяспечыць дзяцей. Затое ўзнікае рызыка распесціць хлопчыка празмернай апекай. Спачатку за яго думае мама, пасля — жонка. А калі жонка раптам кідае небараку, ён не ведае, што яму рабіць і як жыць далей. Дарослы саракагадовы «хлопчык»...

Дый у поўных сем'ях мужчына ўсё часцей — рахманы працоўны «конік» ці разнавіднасць «мэблі». А мама прымае «камандаванне» на сябе. І дзеці засвойваюць менавіта такую мадэль сямейных адносін. Мама цягае каструлі з баршчом свайм дарослым дзецям. Мама знаходзіць ім мужоў-жонак. Мама іх пасля і выганяе. Мама вырашае, як выхоўваць унукаў. «Прадукт» мамчынага выхавання — тое самае пакаленне распешчаных, бязвольных, слабахарактарных мужчын. Мужчын, якіх з маленства вучылі, што галоўнае — гэта паслухмянасць. Такі мужчына прадказальны, паддаецца кантролю, увогуле зручны ў «эксплуатацыі». Але не варта чакаць ад яго рашучасці ў складаных сітуацыях і нейкіх сапраўдных учынкаў.

А «сапраўдны мужык», па якім уздыхаюць паненкі і кабеты, — ён звычайна «нязручны». Ён забяспечвае сям'ю, здольны самастойна прымаць рашэнні і быць той самай «каменнай сцяной». Але мае «пабочныя эфекты» ў выглядзе любові да машыны, рыбалкі, сяброўскіх пагулянак, футболу і г.д. І ўласных думак.

Мужчынам трэба даваць быць мужчынамі. Змалку дазваляць ім быць самастойнымі. І патрабаваць ад іх. Вучыць прапускаць наперад дзяўчат. Саступаць месца бабулям. Насіць маміны сумкі з крамы. Абараняць сябе і тых, хто побач... І не трэба нянькацца з хлопчыкамі да іх саракагоддзя. Інакш у Чырвонай кнізе аднойчы сапраўды давядзецца зрабіць новы запіс — «Мужчына Сапраўдны».

**Валянцін БОЙКА**